**ЛА́ДА**, міфічны вобраз, які трымае парадак на зямлі, лад. Пад апякунствам Л. ўсё ішло належным чынам: пасля дня наступала ноч, пасля зімы — лета. Год складаў круг Л., і ў годзе было тры Ладавыя святы і адно дзядовае (у песнях часта згадваецца малазразумелае паводле сэнсу «Дзід-Лада»). Святы гэтыя прыпадалі якраз на пераломе сонечнага года, на вясну, лета, восень і зіму. Л. апякуе любові. Прыказка «Не з Ладам муж, не з Ладам жонка» паказвае, калі муж не па каханні і жонка не па каханні.

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1846. Прибавления. Кн. 1; Ластоўскі В. Колькі слоў аб даўняй веры беларусаў / Наша ніва. 1910. № 15—17.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ